ISSN 3072-3140, eISSN 3072-4376
Copyright © by Radosław Kaleta, 2025
Creative Commons Attribution-NonComercial 4.0
(CC BY-NC 4.0)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc/4.0/
DOI: https://doi.org/10.31338/uw.ijbg.2025.8

НОВЫЯ ВЫДАННІ ПА БМЗ

Радаслаў Калета ♦ Radosław Kaleta

Варшаўскі ўніверсітэт, Польшча
University of Warsaw, Poland
ORCID: https://orcid.org/0000-0001-6892-9332
e-mail: rkaleta@uw.edu.pls

Дапаможнікі па беларускай мове як замежнай, выдадзеныя ў 2025 г. у Варшаве, Мінску і ў Маскве

Belarusian as a Foreign Language Teaching Materials Published in 2025 in Warsaw, Minsk, and Moscow

Abstract: This article reviews materials for learning Belarusian published in 2025 in Warsaw, Minsk, and Moscow, including those issued by the Department of Belarusian Studies at the University of Warsaw. It discusses their structure, target audiences, and suitability for teaching and learning.

Keywords: Belarusian language, teaching publications, learning materials, glottodidactics, foreign learners.

Рэзюмэ: Тэкст прысвечаны выданням для вывучэння беларускай мовы, якія пабачылі свет у 2025 г. у Мінску, Маскве і ў Варшаве на кафедры беларусістыкі Варшаўскага. Разглядаюцца іх структура, мэтавая аўдыторыя і функцыянальнасць.

Ключавыя словы: беларуская мова, навучальныя матэрыялы, вучэбныя выданні, глотадыдактыка, замежныя навучэнцы.


У 2025 г. пабачылі свет чатыры навучальныя матэрыялы, выдадзеныя ў Варшаве, Мінску і Маскве. Кафедрай беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта быў выдадзены зборнік практыкаванняў і тэкстаў Вольгі Трацяк *Беларуская мова. Практыкаванні і тэксты для чытання* (330 старонак) [гл. Трацяк 2025], які атрымаў фінансаванне з Фонду дыдактычнай дасканаласці Факультэта прыкладной лінгвістыкі Варшаўскага ўніверсітэта.

Публікацыя прызначана для вывучэння беларускай мовы як замежнай на ўзроўнях A1–B1. Дапаможнік спалучае практыкаванні з тэкстамі для чытання і накіраваны на паступовае і сістэмнае развіццё моўных кампетэнцый, у тым ліку разумення пісьмовага тэксту, пашырэння лексічнага запасу і ўдасканалення граматычнай правільнасці. Матэрыялы могуць выкарыстоўвацца як у самастойнай працы, так і на занятках з выкладчыкам. Да выдання далучаны ключ з адказамі, які палягчае самакантроль і саманавучанне. Дапаможнік можа быць выкарыстаны ў акадэмічнай і школьнай дыдактыцы. Рэцэнзенткамі зборніка

былі праф. Ніна Баршчэўская з Варшаўскага ўніверсітэта (шматгадовая загадчыца кафедры беларусістыкі) і праф. Жанна Некрашэвіч-Кароткая з Універсітэта Адама Міцкевіча ў Познані.


У выданні прапануецца 150 практыкаванняў для прыктычнага вывучэння беларускай мовы, якія – як чытаем у прадмове – правяраюць веды па марфалогіі, арфаграфіі, сінтаксісе і лексіцы (у аспекце сінаніміі, антаніміі і параніміі). Практыкаванні рознага тыпу – на дапасаванне, падпарадкаванне, выключэнне лішняга слова, спалучэнне тэрмінаў або паняццяў з іх значэннямі і інш. Кожнае заданне мае пятнаццаць элементаў. Заданні дапамагаюць падрыхтавацца да залікаў, экзаменаў, конкурсаў і алімпіяд па беларускай мове, могуць быць дапаўненнем да практычнай часткі заняткаў па беларускай мове [гл. Трацяк 2025: 5–6].

У другой частцы выдання сабраны розныя тэксты для самастойнага чытання. Тэмы тэкстаў датычаць розных тэм штодзённага жыцця: ежы, прадуктаў харчавання, спорту, беларускіх традыцый і звычаяў, здароўя, медыцыны, свят, міфалогіі, гісторыі, культуры, віншаванняў і г.д.



Ілюстрацыя 1. Вокладка дамапожніка Вольгі Трацяк

Другое выданне таксама выйшла ў Варшаве. Вераніка Бандаровіч падрыхтавала падручнік па беларускай мове пад назвай *Хто? Дзе? Калі? Беларусь у адказах на граматычныя ды арфаграфічныя пытанні* (115 старонак) [гл. Бандаровіч 2025], які атрымаў фінансаванне з Фонду дыдактычнай дасканаласці Факультэта прыкладной лінгвістыкі Варшаўскага ўніверсітэта. Ён прызначаны як для студэнтаў беларускай філалогіі, так і для шырокага кола чытачоў і таму можна яго лёгка спамаваць з Інтэрнету. Рэцэнзенткай зборніка была дац. Марына Свістунова з кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.



Ілюстрацыя 2. Вокладка дамапожніка Веранікі Бандаровіч

Аўтарка падрыхтавала 10 тэм, у якіх закранае лексічныя, культурныя і граматычныя пытанні, напр. канчаткі роднага і меснага склонаў, айконімы, спражэнне дзеясловаў, скланенне беларускіх прозвішчаў, назвы святаў у беларускай мове, правапіс вялікай і малой літары, правапіс складаных назоўнікаў і прыметнікаў ці геаграфія беларускіх прыказак і прымавак. Акрамя тэатэтычных тлумачэнняў і табліц аўтарка прапануе таксама заданні і актуальныя тэксты.


Што важна, аўтарка паказвае і каментуе не толькі норму беларускай мовы, але і ўзус, напр., як людзі гавораць, якія назвы мясцовасцяў выкарыстоўваюць іх жыгары і як іх скланюць, або варыянты скланення імя *Зміцер* – у родным *Зміцера* (норма) і *Зміцера* (варыянт, які часта ўжываецца на практыцы і які раней лічыўся памылкай, бо маем формы, якія пацвярджаюць неабходнасць

Дапаможнікі па беларускай мове як замежнай, выдадзеныя…

наяўнасці зычнага *т*, напр. *Змітрок*, *Змітроўскія Дзяды*, *вёска Змітровічы*, гл. Цыбульскі 2012; Kaleta 2025: 227–228).

Варта адзначыць, што аўтарка пры моўным каментары выкарыстоўвае ў дапаможніку краязнаўчыя рэаліі і параўнанні з польскай і рускай мовамі (якімі найчасцей валодаюць студэнты варшаўскай беларусістыкі), каб паказаць арыгінальныя асаблівасці беларускай мовы.

У Мінску калектыў аўтараў (Лідзія Сямешка, Сяргей Лебядзінскі, Рыгор Ганчар, Людміла Кажухоўская, Таццяна Сандалава) пад рэдакцыяй Лідзіі Сямешкі і Сяргея Лебядзінскага парыхтаваў выданне *Беларуская і руская мовы як замежныя. Узроўні валодання* (262 старонкі) [гл. Сямешка і інш. 2025]. Гэтыя матэрыялы рэцэнзавалі дац. Вікторыя Лухверчык з кафедры моваznаўства і лінгвадыдактыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка і дац. Таццяна Мельнікава з кафедры беларускай і рускай моў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Кніга была дапушчаная Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для слухачоў дадатковай адукацыі дарослых па праграме павышэння кваліфікацыі *Беларуская і руская мовы як замежныя. Узроўні валодання*.



Ілюстрацыя 3. Вокладка дапаможніка Беларуская і руская мовы як замежныя. Узроўні валодання

Матэрыялы ў дапаможніку былі падрыхтаваныя на аснове вынікаў навукова-даследчай працы Распрацоўка адукацыйных стандартаў і тыпавых тэстаў па беларускай і рускай мовах як замежных, якая выконвалася ў рамках дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў *Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства* (2016–2020) у дзяржаўнай установе адукацыі Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы (агульнае кіраўніцтва: доктар фіз.-мат. навук, прафесар В.А. Гайсёнак, выканаўцы даследавання: навуковы кіраўнік Л.І. Сямешка, навуковы сукіраўнік С.І. Лебядзінскі, В.У. Барысенка, Л.С. Кныш, С.М. Якуба, Т.Р. Рамза, Н.П. Шакун, тэхнічнае забеспячэнне: Н.С. Клішэвіч, Н.С. Курыловіч) [гл. Сямешка і інш. 2025: 5].

Як чытаем у выданні [гл. Сямешка і інш. 2025: 3–5], у гэтым вучэбным дапаможніку прадстаўлена сістэматызаванае апісанне мінімальных патрабаванняў да паасобных ўзроўняў валодання беларускай мовай як замежнай. Яно заснавана на цэласнай сістэме параметраў, якія характарызуюць камунікатыўную кампетэнцыю як асноўную мэту і вынік навучання, і прадугледжвае падзел узроўняў агульнага валодання беларускай мовай як замежнай на шэсць ступеняў [гл. Сямешка і інш. 2025: 5]: A1 – Элементарны ўзровень, A2 – Базавы ўзровень, B1 – Сярэдні (парогавы) узровень, B2 – Сярэдні (павышаны) узровень, C1 – Узровень кампетэнтнага валодання, C2 – Узровень дасканалага валодання. Пры чым, аўтары не вылучаюць узроўня D, які абазначае валоданне мовай на ўзроўні носьбіта мовы.

> Шасціўзроўневая сістэма валодання іншаземцамі беларускай мовай будуецца паводле прынцыпу пасялдоўнага разгалінавання і складаецца з больш нізкіх і больш высокіх узроўняў у класічнай трохузроўневай сістэме: A1, A1 – элементарнае валоданне мовай; B1, B2 – самадастатковае валоданне мовай; C1, C2 – свабоднае валоданне мовай [гл. Сямешка і інш. 2025: 3].

Дзейнасна-арыентаваны падыход да апісання ўзроўняў беларускамоўнай кампетэнцыі


замежных навучэнцаў рэалізуецца праз дакладна сфармуляваныя дэскрыптары камунікатыўных уменняў і стратэгій у адпаведнасці з міжнароднымі нормамі патрабаванняў да ўзроўняў камунікатыўнай кампетэнцыі. Гэта дазваляе сістэматызаваць працэс авалодання мовай як сродкам камунікацыі, удакладніць змест і структуру навучання на розных узроўнях, а таксама вызначыць ступень валодання беларускай мовай замежнымі навучэнцамі ў адпаведнасці з сучаснымі падыходамі і фарматамі ацэнкі [гл. Сямешка і інш. 2025: 3–4]. Для кожнага ўзроўню даецца апісанне складнікаў камунікатыўнай кампетэнцыі: разуменне вусных тэкстаў (аўдыяванне), разуменне пісьмовых тэкстаў (чытанне), пісьмо, гаварэнне (інтэракцыя і прадукцыя), змест моўнай кампетэнцыі, функцыянальна-інтэнцыйны каталог, тэматычын каталог.

Як сцвярджаюць аўтары, дапаможнік прызначаны для слухачоў праграм дадатковай адукацыі дарослых па вучэбнай праграме *Беларуская і руская мовы як замежныя. Узроўні валодання*, а таксама для выкладчыкаў беларускай і рускай моў як замежных і спецыялістаў, якія працуюць з замежнымі студэнтамі ў сферы міжнароднай адукацыі. Ён можа быць карысным і для замежных грамадзян, якія вывучаюць беларускую або рускую мову. Матэрыялы дапаможніка таксама могуць выкарыстоўвацца распрацоўшчыкамі і экспертамі ў галіне тэставання, выкладчыкамі, аўтарамі вучэбнай літаратуры, супрацоўнікамі адміністрацый вышэйшых навучальных устаноў, а таксама асобамі, якія рыхтуюцца да працэдуры вызначэння ўзроўню валодання адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь для атрымання беларускага грамадзянства.

Такое апісанне ўзроўняў беларускамоўнай камунікатыўнай кампетэнцыі замежнікаў было найбольш актуальнай задачай сучаснай беларусістычнай глотадыдактыкі апошніх дзесяцігоддзяў, застаецца яшчэ вельмі актуальнае пытанне на будучыню – магчымасці здаць дзяржаўны экзамен і атрымаць дзяржаўны сертыфікат па беларускай мове як замежнай.

На канцы дапаможніка знаходзіцца спіс рэкамендаваных 83 крыніц па беларускай і рускай мовах як замежных аўтараў-прадстаўнікоў айчыннай беларусістычнай (і русістычнай) глотыдадктыкі (беларускай і рускай лінгвадыдактыкі) без уліку даробку замежнай беларусістычнай глотыдадктыкі. Пры адным артыкуле, надрукаваным у часопісе “Беларуская мова як замежная” дапісалі звесткі – Мінск: РІВШ.

У Маскве выйшаў з друку самавучак Міхаіла Каваля *Белорусский яяык без репетитора. Самоучитель белорусского языка* (288 старонак, гл. Коваль 2025).



Ілюстрацыя 4. Вокладка дамапожніка *Белорусский яяык без репетитора*

У дапаможніку рускамоўны навучэнец знойдзе асноўныя граматычныя і правапісныя тэмы (напр., скланенні, спражэнні, правапіс *у* кароткага), практыкаванні з адказамі на канцы вывання і карысную лексіку для размоўнай практыкі, а таксама прыказкі і прымаўкі. Паводле выдаўцы матэрыял даецца максімальна зразумела і даступна з актуальнымі прыкладамі, дзякуючы чаму можна лепш засвоіць граматычныя правілы і адчуць асаблівасці беларускай мовы. Падручнік рэкамендуецца ўсім, хто вывучае беларускую мову, перад усім тым, хто робіць гэта самастойна.

Дапаможнікі па беларускай мове як замежнай, выдадзеныя…

У дапаможніку 30 урокаў з адказамі да практыкаванняў. Выданне пабудаванае ў асноўным на граматычным прынцыпе з элементамі размоўніка (гатовыя сказы з перакладам на рускую мову і пададзеным правільным вымаўленнем), выбранымі звесткамі пра культуру (напр., пра асноўныя стравы беларускай кухні) і практыкаваннямі. Моўны каментар і заданні да практыкаванняў даюцца на рускай мове. Выданне не мае рэцэнзента ні спісу выкарыстанай літаратуры (шкада, бо гэта важна ведаць, адкуль аўтар узяў такія звесткі, як напрыклад у ніжэйпададзенай цытаце). Выступаюць у ім розныя памылкі і русізмы (пазначаем у прыкладах зорачкай), напр. *Я *немнога разумею па-беларуску = Я немного понимаю по-белорусски.* Павінна быць форма з яканнем – *нямнога*, але ў беларускай мове ёсць свае эквіваленты, як *няшмат*, *трохі*, *крыху*. Мэрытарычная памылка з'яўляецца ўжо на першай старонцы ў другім сказе першага ўрока, дзе даюцца звесткі пра беларускую мову:

> Белорусский язык (беларуская мова) относится к группе восточнославянских языков. Он близок русскому и *белорусскому языкам; письменность – на основе кириллицы. Древнейшие известные памятники на белорусском языке относятся к X–XI вв. Общее число говорящих в мире на белорусском языке – около 8 миллионов человек [Коваль 2025: 3].

Аўтар пэўна хацеў напісаць пра падабенства беларускай да ўкраінскай мовы. Самыя старыя помнікі X–XI стст. з тэрыторыі сучаснай Беларусі былі напісаныя хутчэй за ўсё на царкоўнаславянскай а не беларускай мове. Моўныя рысы характэрныя для старабеларускай мовы пачынаюць з'яўляцца ў помніках XIII –XIV стст. Коваль піша таксама пра колькасць носьбітаў беларускай мовы, але не ў Беларусі, толькі ў свеце без звестак пра моўную сітуацыю ў Беларусі.

Аўтар падкрэслівае блізкароднасць беларускай і рускай моў і сцвярджае, што шматлікія граматычныя тэмы будуць зразумелы інтуіцыйна і таму яго каментар будзе даваццца толькі па меры неабходнасці [гл. Коваль 2025: 31]. У цэлым, станоўчай з'явай можна лічыць выпуск матэрыялаў па беларускай мове ў Расіі, варта аднак больш старанна іх рыхтаваць і забяспечыць навукова-метадычнае рэцэнзаванне.

Падсумоўваючы, варта адзначыць, што нягледзячы на складаную сітуацыю беларускай мовы ў самой Беларусі, працягваюцца выдавецкія ініцыятывы па папулярызацыі беларускай мовы сярод беларусаў эмігрантаў і замежнікаў. Разгледжаныя выданні, якія пабачылі свет у 2025 г. у Варшаве, Мінску і Маскве, сведчаць пра захаванне цікавасці да вывучэння беларускай мовы як замежнай і пра разнастайнасць падыходаў да яе выкладання. Аналіз дапаможнікаў паказвае, што яны адрозніваюцца паводле структуры, мэтавай аўдыторыі і метадычных прынцыпаў: ад практыкаванняў і тэкстаў для развіцця моўных навыкаў да сістэматызаванага апісання ўзроўняў валодання мовай і матэрыялаў для самастойнага навучання. Асаблівую ўвагу прыцягваюць выданні, якія спалучаюць вывучэнне граматыкі і лексікі з актуальнымі тэкстамі, культурнымі рэаліямі і практычнымі камунікатыўнымі задачамі.

Разам з тым агляд выявіў неабходнасць далейшага ўдасканалення вучэбнай літаратуры, у прыватнасці забеспячэння яе навуковай дакладнасці, метадычнай якасці і рэцэнзавання. Важным напрамкам развіцця беларускай глотадыдактыкі застаецца таксама стварэнне ўмоў для аб'ектыўнай ацэнкі моўных кампетэнцый замежных навучэнцаў, у тым ліку распрацоўка сістэмы дзяржаўнай сертыфікацыі валодання беларускай мовай як замежнай. Такім чынам, разгледжаныя публікацыі не толькі папаўняюць фонд навучальных матэрыялаў, але і выяўляюць актуальныя патрэбы і перспектывы далейшага развіцця галіны, якой з'яўляецца беларусістычная глотадыдактыка.

References

Бандаровіч Вераніка. 2025. *Хто? Дзе? Калі? Беларусь у адказах на граматычныя ды арфаграфічныя пытанні. Варшава [Bandarovič Veranika. 2025. Xto? Dze? Kali? Belarus' u adkazax na hramatyčnyja dy arfahrafičnyja pytanni. Varšava].*

Коваль Михаил. 2025. *Белорусский яяык без репетитора. Самоучитель белорусского языка*. Москва [Koval' Mixail. 2025. *Belorusskij jajayk bez repetitora. Samoučitel' belorusskogo jazyka*. Moskva].

Сямешка Лідзія, Лебядзінскі Сяргей, Ганчар Рыгор, Кажухоўская Людміла, Сандалава Таццяна. 2025. *Беларуская і руская мовы як замежныя. Узроўні валодання*. Пад рэд. Л. Сямешкі і С. Лебядзінскага. Мінск [Sjameška Lidzija, Lebjadzinski Sjarhej, Hančar Ryhor, Kažuxoŭskaja Ljudmila, Sandalava Taccjana. 2025. *Belaruskaja i ruskaja movy jak zamežnyja. Uzroŭni valodannja*. Pad rèd. L. Sjameški i S. Lebjadzinskaha. Minsk].

Трацяк Вольга. 2025. *Беларуская мова. Практыкаванні і тэксты для стачытання. Варшава [Tracjak Vol'ha. 2025. Belaruskaja mova. Praktykavanni i tèksty dlja stačytannja. Varšava].*

Цыбульскі Сямён. 2012. *Гавары правільна: "Зміцра", а не "Зміцера"* [Cybul'ski Sjamën. 2012. *Havary pravil'na: "Zmitra", a ne "Zmicera"*] [online] https://nashaniva.com/101761 [9.11.2025].

Kaleta Radosław. 2025. *Zawiłości fleksyjne imion i nazwisk polskich i białoruskich*. W: Radosław Kaleta. *Moja białorutenistyka. Z polsko-białoruskich studiów lingwistycznych i glottodydaktycznych*. Warszawa. 205–236.